# У дапамогу настаўнікам

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі выпусціла бюлетэнь "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку", які дапаможа паглядзець на перыяды развіцця выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі па-новаму.**

Выхаванне падрастаючага пакалення можа быць плённым толькі пры дасканалым і паглыбленым вывучэнні педагагічнай спадчыны. Выкарыстанне назапашанага пакаленнямі вопыту, веданне асноўных этапаў развіцця выхаваўча-адукацыйнага працэсу, асаблівасцей яго функцыянавання ў розныя гістарычныя эпохі дапамогуць у распрацоўцы сучасных рэформ.

У бюлетэні "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку (2021, № 7) змешчаны бібліяграфічны спіс крыніц інфармацыі "З гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі" (складальнік Г.В.Брага), у якіх разглядаюцца асноўныя перыяды развіцця выхаваўчага працэсу ў Беларусі, прадстаўлена агульная характарыстыка сістэмы адукацыі ад зараджэння да цяперашняга часу, адлюстравана роля вядомых асветнікаў і педагогаў у станаўленні і развіцці айчыннай школы.

Спіс складаецца з наступных раздзелаў і падраздзелаў: "Зараджэнне выхаваўча-адукацыйнага працэсу", "Выхаванне і навучанне ў першабытным грамадстве", "Уплыў хрысціянства на развіццё адукацыі", "Школьная адукацыя ў XIII—XVIII стст.", "Станаўленне сістэмы адукацыі ў Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.", "Стварэнне савецкай сістэмы адукацыі і распрацоўка яе тэарэтычных асноў", "Развіццё сістэмы адукацыі ў БССР у другой палове XX ст.", "Сістэма адукацыі ў Беларусі з 90-х гг. XX ст.". Усе раздзелы і падраздзелы спіса суправаджаюцца невялікімі нарысамі.

Бібліяграфічны спіс адрасуецца педагогам, навучэнцам, студэнтам, выкладчыкам.

**Кацярына ВАРАНЬКО,**
**вядучы бібліёграф**
**Нацыянальнай бібліятэкі**
**Беларусі.**